3. Ирзабеков, В. Тайна русского слова. Заметки нерусского человека. – М.: Даниловский благовестник, 2012. – 200 с.

УДК 908(476)

## КРАЯЗНАЎСТВА ЯК АДЗІН З НЕАБХОДНЫХ ЭЛЕМЕНТАЎ ПАСПЯХОВАЙ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ Ў ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

*Хаданёнак В.М.,*
*Віцебск, УА "ВДТУ"*

Краязнаўства — гэта комплекснае навукова-даследчае і папулярызатарскае вывучэнне пэўнай тэрыторыі і назапашванне ведаў пра яе. Аналіз выхаваўчай працы ва ўніверсітэтах на працягу апошніх гадоў у нашай краіне дае падставы разглядаць краязнаўства пераважна ў гістарычным аспекце. Зразумела, што для гэтага створана грунтоўная база і падмурак папярэднімі даследчыкамі і навукоўцамі. Асабліва плённа на ніве гістарычнага краязнаўства шчыравалі М.В. Без-Карніловіч, Г.А. Каханоўскі, М.І. Каспяровіч, А.П. Сапуноў. У наш час іх справу працягваюць М.В. Півавар, В.А. Ермалёнак, І.М. Пракаповіч і інш. На жаль у значна меньшай меры чым гістарычны, сёння распрацоўваюцца такія накірункі краязнаўства, як геаграфічны, біялагічны, літаратурны, этнаграфічны. Вядома ж, што гэтыя лакуны рана ці позна будуць запоўнены, бо менавіта комплекснае краязнаўства дае куды больш шырокія перспектывы для яго паспяховага выкарыстання ў выхаваўчым працэсе вышэйшых навучальных устаноў.

Краязнаўства садзейнічае і спрыяе фарміраванню пачуцця любові не толькі да сваёй малой радзімы, але і Беларусі ўвогуле, што надзвычай актуальна сёння ў святле пашырэння пэўнага нацыянальнага нігілізму і бяспамяцтва. Краязнаўчая праца ў розных сваіх формах з'яўляецца тым мастом, які лучыць і яднае працэс навучання і выхавання з жыццём.

З традыцыйных форм краязнаўства, якімі актыўна карыстаюцца на сённяшні дзень выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў можна вылучыць наступныя:

- арганізацыя і правядзенне для педагагічных работнікаў і навучэнцаў турыстычных злётаў, канферэнцый, конкурсаў, семінараў, курсаў і інп.;
- выяўленне, вывучэнне, сістэматызацыя, абагульненне і прапаганда перадавога вопыту краязнаўчай, грамадзянска-патрыятычнай і экскурсійнай работы з моладдзю;
- кантроль, папулярызацыя і метадычнае забеспячэнне дзейнасці музеяў устаноў адукацыі;
- кантроль і метадычнае забеспячэнне правядзення рэспубліканскіх акцый: Тыдзень турызму і краязнаўства для дзяцей і моладзі, "Жыву ў Беларусі і тым ганаруся!" і інш.;

Нам падаецца, што ўмовы сённяшняга часу змушаюць нас да пошукаў новых, нетрадыцыйных і альтэрнатыўных форм краязнаўства, каб мацней заахвоціць студэнцкую моладзь да вывучэння і папулярызацыі мінулага і сучаснасці свайго краю. Перш за ўсё гэта можа выражацца ў больш актыўным выкарыстанні найноўшых мультымедыйных тэхналогій, шматслойных сучасных картаграфічных носьбітаў, магчымасцяў трохмернага мадулявання і дынамічнай анімацыі, GPS навігацыі, як у працэсе выхавання, так і пры правядзенні краязнаўчых мерапрыемстваў (экскурсіі, семінары, падрыхтоўка рознага кшталту выстаў і інш.). Важна адсочваць станоўчыя новаўвядзенні, якімі актыўна карыстаецца Сусветная турыстычная арганізацыя (World Tourism Organization - WTO) і рознага кшталту рэгіянальныя і нацыянальныя арганізацыі.

Вельмі важна каб выхаваўчы працэс на аснове краязнаўства ва ўніверсітэтах трымаўся не толькі на "голым энтузіязме" выкладчыкаў, але і знаходзіў падтрымку і разуменне на ўзроўні органаў мясцовай выканаўчай улады. Да прыкладу: куды больш істотны вынік дае менавіта наведванне і "паглыбленне" ў краязнаўчую цікавостку, чымсці сухі расповяд пра яе на лекцыі ці семінарскім занятку. А гэта вымагае выдаткоўванне пэўных грашовых сродкаў,

якія не заўжды ў дастатковай колькасці маюцца ў кіраўніцтва вышэйшых навучальных устаноў. На сённяшні дзень дапамога мясцовай улады развіццю выхаваўчага працэса на аснове краязнаўства даволі часта носіць дэкларатыўны характар.

Між тым установы адукацыі мусяць і самі шукаць некаторыя шляхі па "самаакупаемасці" і нават камерцыяналізацыі краязнаўчай дзейнасці. Напрыклад, камерцыйнае значэнне краязнаўчых ведаў больш за ўсё праяўляецца ў гэтак званых "сувенірах". Ва усім свеце сувенір – гэта перш за ўсё прадукт канкрэтнай мясцовасці. З Аўстраліі канадзец ці бельгіец прывязе аўстралійскі тавар, з Японіі – японскі. У любым выпадку размова ідзе пра не зусім патрэбныя ў практычным жыцці рэчы. Гандаль такімі таварамі як «корань мандрагоры» ці «рог адзінарога» заўжды трымаўся на апавяданнях гандляроў пра далёкія краіны, дзівосныя прыгоды і незвычайны лад жыцця. Сам па себе тавар не меў ніякай каштоўнасці без краязнаўчага «ярлыка». Таму варта больш сур'ёзна падыходзіць да такіх паняццяў, як "камерцыйнае засваенне турыстычных рэсурсаў", рэклама і прапаганда экалагічных, этнічных, культурна-гістарычных прадуктаў.

Такім чынам, выкарыстанне краязнаўства ў выхаваўчым працэсе вышэйшых навучальных устаноў спрыяе не толькі пашырэнню кругагляда і развіццю пазнаваўчых інтарэсаў студэнтаў, але і з'яўляецца важнейшым фактарам для асэнсавання сваёй прыналежнасці да беларускай нацыі і самаідэнтыфікацыі.

УДК 81-271.2

## ДОБРАЕ МАЎЛЕННЕ ЯК ФАКТАР АДЛЮСТРАВАННЯ УНУТРАНАГА СВЕТУ ЧАЛАВЕКА

*Чаеўская М.К.,*
*Мінск, БДУ*

Культура маўлення, на думку многіх даследчыкаў, утрымлівае пэўны набор і мае такую арганізацыю моўных сродкаў, "якія ў вызначанай сітуацыі зносін пры захаванні сучасных моўных норм і этыкі зносін дазваляюць забяспечыць найбольшы эфект у дасягненні пастаўленых камунікатыўных задач" [1, с.17]. У якасці дамінуючага ў азначэнні выступае "найбольшы эфект у дасягненні пастаўленых камунікатыўных задач", але пры ўмове адпаведнасці патрабаванням арталогіі і этыкі зносін. Актуалізуецца выкарыстанне тых элементаў культуры маўлення, якія надаюць разнастайнасць, непаўторнасць, сведчаць пра творчы падыход да арганізацыі маўлення.

Выразнасць у складзе паняцця "добрае маўленне" можа быць разгледжана як імпліцытная і разам з тым абавязковая ўласцівасць, якая прадвызначае ўплывовасць, дзейснасць выказвання, асаблівасці ўспрымання сказанага або напісанага. Трактуемая вельмі часта як прыгажосць, эстэтычнасць маўлення, яна з'яўляецца залежнай ад інтралінгвістычных і экстралінгвістычных умоў. Штрэкер Н.Ю., Плешчанка Т.П., Фядотава Н.В., Чэчат Р.Р., Няфёдава Н.У. ,напрыклад, называюць самастойнасць мыслення гаворачага, добрае веданне ім тэмы, прадмета гаворкі, неабыякавае стаўленне да зместу, уменне зацікавіць, добрае веданне мовы, яе выразных магчымасцей, сістэматычную і ўсвядомленую трэніроўку маўленчых навыкаў, імкненне гаварыць і пісаць выразна з мэтай уздзеяння не толькі на розум, але і на пачуцці слухачоў ці чытачоў.

Узмацняць выразнасць могуць усе элементы мовы, а таксама невербальныя сродкі. Традыцыйна да "асноўных крыніц маўленчай выразнасці" адносяць словы, фразеалагізмы, прыказкі. Асобныя моваэнаўцы да лексічных дадаюць фанетычныя і сінтаксічныя сродкі, спрабуюць пэўным чынам іх класіфікаваць, аднак многія падрабязна характарызуюць толькі тропы і стылістычныя фігуры. Штрэкер Н.Ю., у прыватнасці, лічыць прыймальным разгляд гэтых з'яў праз прызму лінгвістыкі, яе ўзроўняў. Такі падыход, думаецца, з'яўляецца